# «Мае Паставы»



***У рамках конкурсу, прысвечаннага Году малой Радзімы, вашай увазе прадстаўляецца публікацыя, падрыхтаванная намеснікам генеральнага дырэктара па ідэалагічнай рабоце – начальнікам аддзела кадраў Марынай Лявонаўнай Пылінскай***

Паставы – невялікі гарадок Віцебскай вобласці, размешчаны на рацэ Мядзелка. Каб бліжэй з ім пазанёміцца, вам трэба праехаць усяго 100 км ад Астраўца.

Падарожны, які першы раз трапляе ў гэтае мястэчка, адчувае асаблівы каларыт цэнтральнай плошчы. Далёка не кожны беларускі горад можа пахваліцца тым, што ў ім захавалася забудова XVIII стагоддзя. Росквіт Пастаў звязаны з імем вядомага рэфарматара і асветніка, падскарбія Вялікага Княства Літоўскага Антонія Тызенгаўза.

Аматары архітэктурных помнікаў абавязкова павінны наведаць касцёл Святога Антонія (пабудова канца XIX стагоддзя), Свята-Мікалаеўскую царкву і ўнікальны палаца-паркавы комплекс дваранскага роду Тызенгаўзаў.



**Мой родны кут – мая любоў!**

Здаецца слоў на свеце мала,
Пяшчотных, шчырых і яскравых слоў,
Каб расказаць вам пра Паставы
Мой родны кут – маю любоў!

Мясцін прыгожых у свеце мноства,
Але, аб абаяльнасці Пастаў
Не вельмі яркай, нават простой
Вам час даведацца настаў.

Сябры, я ўсіх вас запрашаю
Да нас на свята ўлетку завітаць,
Калі гармонікі зайграюць,
Калі цымбалы зазвіняць.

А горад – чысты і прыгожы
Сваёй гасціннасцю атуліць.
Адчуе сэрцам тады кожны
Зачараванне ціхіх вуліц…

І подых даўніны далёкай
Ад сцен палаца Тызенгаўзаў,
Антонія і Канстанціна крокі
Вы тут пачуеце адразу.

І ўжо ніколі не забыць вам
Празрыстасць Мядзілкі-рачушкі,
Над ёю ў небе чыстым-чыстым
Палёт прыгожай белай птушкі.

Касцёл чырвоны над вадою,
Узнёслы калакольны звон,
У сэрцах вашых застануцца
Як казка дзіўная, як сон…

Здаецца слоў на свеце мала,
Пяшчотных, шчырых і яскравых слоў,
Каб расказаць вам пра Паставы
Мой родны кут – маю любоў!



**Мядзелка-рачушка**

Ой ты Мядзелка-рачушка,
Прашапчы ты мне на вушка
Дзе ты бегала, пятляла,
Каму сэрцанька аддала?

За Паставамі на ўзгорку
Стройны клён расце высокі
У мяне глядзіцца ён
Любы мне прыгожы клён!

Ой ты Мядзелка-рачушка,
Прашапчы ты мне на вушка,
А чаму ж засумавала,
І вадзіца мутнай стала?

А таму сумуя я,
што мне Матухна-зямля
не дазволіць з ім сустрэцца
разаб'е дачушцы сэрца…

Ой ты Мядзелка-рачушка,
Прашапчы ты мне на вушка,
Ты чаму так абмялела,
Ад кахання захварэла?

Я да мілага прабіцца
Спрабавала скрозь зямліцу,
Мае слёзы над вадою
На клён выпалі расою.

Ой ты Мядзелка-рачушка,
Ты ляці блакітнай стужкай,
Цябе буду суцяшаць,
Песні звонкія співаць!

**Мае Паставы**

Ёсць гарадок у Беларусі адзін,
Завецца Паставы, жыла я ў ім,
У горадзе гэтым шчаслівa прайшла
Дзяцінства майго залатая пара.

Мае Паставы – сінявокі небасхіл,
Мае Паставы – над вадой шум белых крыл,
Мае Паставы, закаханая ў вас я,
Мае Паставы – зямля бацькоўская мая!

Тут пастаўчане так дружна жывуць,
А ўлетку на свята ўсіх сабяруць,
Гасцей хлебам з соллю ідуць сустракаць,
Гармонік гучыць, дый цымбалы звіняць!

Не ведаю я пра свой будучы лёс,
Куды б ён мяне ў жыцці не занёс,
Я горад свой буду заўжды ўспамінаць,
Бо словы ў сэрцы маім усё гучаць:

Мае Паставы – сінявокі небасхіл,
Мае Паставы – над вадой шум белых
крыл,
Мае Паставы, закаханая ў вас я,
Мае Паставы – зямля бацькоўская мая!



**Пастаўчанка**

У Паставах летнім ранкам
Я сустрэў яе аднойчы,
У сэрцы ўспыхнула маланка,
Як ўбачыў ясны вочы!
Пастаўчанка, Пастаўчанка,
Пастаўчаначка мая,
Закаханы, закаханы, закаханы ў цябе я!
У залатыя твае косы, у блакіт тваіх вачэй,
Дык давай жа, Пастаўчанка,
пазнаёмімся хутчэй!
А яна, прайшоўшы міма,
Усміхнулася яскрава.
Стала думкамі маімі
І спакой, і сон забрала.
Кожны ранак у тым жа месцы
Пастаўчанку я чакаю,
Бо жыве надзея ў сэрцы,
А душа ізноў спявае:
Пастаўчанка, Пастаўчанка,
Пастаўчаначка мая,
Закаханы, закаханы, закаханы ў цябе я!
У залатыя твае косы, у блакіт тваіх вачэй,
Дык давай жа, Пастаўчанка,
пазнаёмімся хутчэй!

*Марына Пылінская*

